ДУК «Бібліятэчная сетка Хоцімскага раёна»
Батаеўская бібліятэка-музей

# Народнае мастацкае ткацтва

Віртуальная выстава

Народнае мастацкае ткацтва – адзін з самых пашыраных відаў народнага выяўленчага мастацтва. Але было б зусім няправільна ацэньваць яго толькі з пазіцыіі прыгажосці, арыгінальнасці арнаментыкі, каларыту.

Кожны ўзор – гэта сімвал – ураджаю, працы, шчасця, святаў, павагі да продкаў, кахання, любві.




**Кацар, М. С. Беларускі арнамент : Ткацтва. Вышыўка / М. С. Кацар. — 3-е выданне. — Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2013. — 224 с. : іл.**

У кнізе сабраны ўнікальны матэрыял пра народнае мастацкае ткацтва і вышыўку.Праз даваенныя запісы,замалёўкі і фотасдымкі вобразна і разнабокава раскрываецца паэтычная душа беларускага народа,яго бачанне прыроды і яе ўзаемасувязі з чалавекам і яго жыццём.

*Гэтая праца —*
*гімн адвечнаму імкненню*
*нашых продкаў*
*да прыгожага,*
*няўтольнай празе*
*праз тканы і вышыты ўзор*
*выказаць сваё*
*разуменне жыцця, свету,*
*космасу,*
*хваласпеў умелым рукам,*
*светлай,*
*добрай, паэтычнай душы*
*нашай сялянкі.*

## ПРА ШТО РАСКАЗВАЮЦЬ УЗОРЫ

Народнае мастацкае ткацтва — адзін з найбольш папулярных і пашыраных відаў народнага мастацтва. Між тым яно яшчэ слаба вывучана. Мы звыкла ацэньваем тканыя рэчы з пазіцыі прыгажосці, адмысловасці арнаментыкі, гармоніі каларыту. Але народнае ткацтва — яшчэ і бяздонная крыніца культурна-гістарычных звестак. Што ні ўзор — то сімвал. Сімвалы ўраджаю: Спарыш, Рай, Багач. Яны вучаць любіць Маці-Зямлю, працу, дабівацца добрага ўраджаю. Сімвалы святаў: Купала, Каляда, Масленіца, Вялікдзень. Тут — радасць, весялосць, гонар за вынікі сялянскай працы. Сімвалы памяці: Дзяды, Радаўніца, любоў і павага да продкаў. Усё, што захавана ў народным ткацтве, не пералічыць, але кожны ўзор сімвалізуе дабро, праўду, прыгажосць, любоў, гонар за чалавека і яго працу, кожны ўзор мае сваё прызначэнне і сваю назву.



Узор сонца



Узор зямлі



Узор абуджэння прыроды вясною



Каханне пачынаецца



Каханне ў росквіце



Каханне без узаемнасці

## ПОДЫХ ЯЗЫЧНІЦТВА

Старажытная язычніцкая культура ў многім таямнічая і незразумелая для нас. Амаль усё забылася, сёння сэнс многіх з'яў і сімвалаў нам невядомы. Але яны захаваліся ў нашым жыцці: у абрадах, звычаях, сімвалах, матывах; мы і самі часам не падазраваем пра гэта. Захаваліся прозвішчы старажытнаславянскага язычніцкага паходжання: Жыцень, Трызна, Купала, Жаўрук, Заранка, Сяўрук, Журба, Зязюля, Каляда. Захаваліся назвы і паняцці: Жур, Буй, Яр, Ярыла, Волат, Курган, Пярун, Русалка, Масленіца, Дзяды. Славянская язычніцкая міфалогія жывіла творчасць В.Дуніна-Марцінкевіча, Ф.Багушэвіча, Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, К.Буйло і інш.

## ЯК “ЧЫТАЦЬ” УЗОРЫ

У народным мастацкім ткацтве вельмі шмат узораў падобных па характары і малюнку, таму іх часта блытаюць. Вось, напрыклад, узор "зорка". Яна пакладзена ў аснову вобраза маці, чалавека, сімвала ўраджаю. Тым не менш ёсць між імі пэўная розніца. Вобраз маці — гэта зорка, аблямаваная пышным вянком і гірляндай з кветак, прычым аблямоўка можа быць квадратнай ці васьмівугольнай. Вобраз чалавека — таксама зорка, але яе чатырохвугольная аблямоўка значна прасцейшая, ланцужковая. Сімвал ураджаю Спарыш — гэта ўжо не зорка, а разетка, скампанаваная з чатырох жытнёвых каласкоў, размешчаных пад прамым вуглом, адзін да аднаго. Можа быць і аблямоўка, але не абавязкова.



Посцілка з успаўленнем чалавека-працаўніка



Сімвал росквіту прыроды, жыцця



Узор жыцця



Матыў Жыценя на тканых вырабах



Узор зямлі

## УЗОРЫ ЖЫЦЦЯ

"Вышываюць гэты ўзор тады, калі трэба прасіць Бога, каб ачуняў чалавек,. А яшчэ — калі ў бабы няма дзяцей". Скампанаваны гэты ўзор з дзвюх частак: ромб з адросткамі-прамянямі — Сонца, такі ж ромб, але прамяні накіраваны ўнутр, — Зямля. Каб выказаць ідэю росквіту прыроды, жыцця, сімвал Сонца змяшчаецца ў сімвал Зямлі.

## ЯК РОБІЦЦА "ЗАПІС«

Калі жанчына садзіцца за работу, яна, як і пісьменнік, кампазітар ці мастак, выбірае тэму твора, абдумвае яго план, кампазіцыю, каларыт, вызначае галоўныя і дадатковыя вобразы. Галоўнае месца ў арнаментыцы посцілкі займае матыў у выглядзе вазона. Гэта — сама майстрыха. Вышэй — васьміканцовая зорка, сімвал кахання. Так майстрыха выказала мару мець добрага, любімага мужа, гаспадара ў сям'і, бацьку дзяцей. Тут жа бачым і ромб з маленькіх ромбікаў — сімвал Маці Зямлі-Карміцелькі.



Узор жаночая доля



Дыван з адлюстраваннем сямейнага радаводу

## ДЫВАН-РАДАВОД

На Гродзеншчыне сустракаюцца складана вытканыя так званыя падвойныя дываны, якія вызначаюцца багата распрацаванай кампазіцыяй дэкору, нярэдка вельмі старажытнай і загадкавай. Гэта запаветны дыван, які сімвалізуе вечнасць роду, здароўе і моц сям'і.



Узор роднай Беларусі. Звычайна гэта быў узор скампанаваны з квадратаў і кругоў, што сімвалізавала сонца і зямлю. Існавалі таксама матывы ракі (папярэчныя палосы, якія нагадваюць рабізну на вадзе), вады (быццам кругі на вадзе, але складзеныя з прамавугольных кірпічыкаў), лесу, дубровы (звычайна некалькі радоў пазнальных матываў магутных дрэваў), поле, лугу (кветкі ўсіх магчымых колераў), жывёлаў, птушак.



Вобразы чалавека, сям'і, дзяржавы. Сімвал чалавека васьміканцовая зорка — адзін з самых пашыраных сімвалаў у беларусаў. Бярозка ці рабіна — вобраз дзяўчыны, клён (явар) — хлопца. Сям'я — чатыры крыжа падобнаспалучаныя разеткі, нярэдка ў арнаментальнай аблямоўцы.



Вобраз кахання. Тут былі сумныя вобразы жаночай долі, русалкі (апошняя досыць умоўная ўвыглядзе букета кветак) і даволі гарэзлівыя вобразы фізічнай блізкасці мужчыны і жанчыны. Распаўсюджаным арнаментам была дзяучына з поднятымі рукамі, якая трымае каласы і кветкі – Лада, багіня кахання і прыгажосці.



Вобраз маці. У тканым і вышываным арнаментах вобраз Маці сустракаецца ў трох варыянтах: у выглядзе жаночай фігуры, у выглядзе абмаляванай гірляндаю зоркі і у выглядзе схематычнага дрэва. Нярэдка вобраз суправаджаўся сімваламі сонца, месяца, агню, ветру, што падкрэслівала раўназначнасць гэтых вобразаў.



Вобраз Зямлі-Карміцелькі набыў выгляд ромба,запоўненнага маленькімі Квадрацікамі ці ромбікамі. Гэта нібы зярняткі, роўна засеяныя на полі рукой селяніна.

**Што такое традыцыйнае ткацтва? Калі яно ўзнікла і як развівалася?**
**Адказы на гэтыя і іншыя пытанні можна знайсці ў кнізе доктара мастацтвазнаўства, прафесара**
**Міхаіла Сяргеевіча Кацара (1906–1995 гг.)**

# «БЕЛАРУСКІ АРНАМЕНТ : ТКАЦТВА. ВЫШЫЎКА»

**Яго імя трывала ўвайшло ў беларускую культуру. У яго кнізе сабраны даваенныя запісы, замалёўкі і фотаздымкі — каштоўны матэрыял для даследчыкаў духоўнай культуры беларускага народа, паколькі такіх запісаў ужо ніхто ніколі не зробіць. Кніга змяшчае унікальны матэрыял (у т.л. каля 600 каляровых і чорна-белых ілюстрацый. Выданне разлічана на гісторыкаў, этнографаў, мастацтвазнаўцаў, фалькларыстаў і ўсіх, хто цікавіцца культурай беларусаў.**